**Роля асобы настаўніка ў фарміраванні жыццёвых перакананняў вучняў**
**Урок беларускай літаратуры па апавяданні І. Навуменкі “Настаўнік чарчэння”**
**(7 клас)**

**Вікторыя Уладзіміраўна Кот,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
гімназіі № 1 г. Жлобіна

**Галоўная праблема настаўнікаў-філолагаў – прыцягнуць вучняў да чытання. Прымусіць немагчыма, можна толькі зацікавіць. Завалодаць увагай вучняў можна праз розныя метадычныя прыёмы.**

**Прапануем урок па вывучэнні апавядання І. Навуменкі “Настаўнік чарчэння”. На ўроку выкарыстоўваюцца праблемныя, пошукавыя, даследчыя прыёмы, якія спрыяюць засваенню ведаў, развіццю самастойнасці мыслення, творчых здольнасцей вучняў.**

**Тэма: І. Навуменка. “Настаўнік чарчэння”. Роля асобы настаўніка ў фарміраванні жыццёвых перакананняў вучняў**

**Мэта:** усведамленне вучнямі ролі настаўніка ў фарміраванні жыццёвых перакананняў вучняў.

**Задачы:**

- высветліць першыя чытацкія ўражанні ад апавядання “Настаўнік чарчэння”;
- акрэсліць ролю настаўніка ў фарміраванні жыццёвых перакананняў вучняў;
- звярнуць увагу вучняў на нетрадыцыйны падыход Апалінарыя Феакціставіча ў выкладанні прадмета;
- вызначыць ролю мастацкай дэталі ў раскрыцці вобраза настаўніка;
- выхоўваць павагу да людзей, якія самаахвярна працуюць на карысць сваёй Радзімы.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік па беларускай літаратуры для 7 класа; лісты з заданнямі, партрэт Авідзія, партрэт І. Навуменкі.

**Ход урока**

**І. Матывацыйна-арганізацыйны этап**

**Настаўнік** *(трымае ў руках званочак)*. З чым у вас асацыіруецца прадмет, які я трымаю ў руках? (*Школа, настаўнік, урок, перапынак…*). Як вы думаеце, пра чалавека якой прафесіі сёння на ўроку пойдзе гаворка? (*Настаўнік паведамляе тэму ўрока.)*

Выберыце з прапанаванага спісу задачы, якія вы лічыце найбольш важнымі для сябе падчас нашага ўрока (прыём "Зрабі выбар"). Адзначце іх на лістах з заданнямі і агучце.

Задачы ўрока:

- ✓ пазнаёміцца з героямі апавядання;
- ✓ даведацца пра нетрадыцыйны падыход Апалінарыя Феакціставіча ў выкладанні чарчэння;
- ✓ зразумець ролю настаўніка ў фарміраванні жыццёвых пераканнняў вучняў;
- ✓ вызначыць ролю мастацкай дэталі ў характарыстыцы вобраза настаўніка;
- ✓ зразумець ролю настаўніка ў жыцці чалавека;
- ✓ паспяхова выканаць заданні.

Звярніце ўвагу на пытанне, адказаць на якое патрэбна будзе ў канцы ўрока (*прыём "Ключавое пытанне"): "Якім павінен быць настаўнік, каб стаць прыкладам для сваіх вучняў?"*

**II. Пазнавальна-аперацыйны этап**

**Настаўнік.** Запішыце асацыяцыі, якія ўзніклі пасля прачытання апавядання Івана Навуменкі "Настаўнік чарчэння", на стыкерах і прымацуйце іх на дошцы *(прыём "Воблака слоў")*.

*(Настаўнік, веды, школа, вайна, лацінская мова, вучні, чарчэнне, самалёт, табакерка, прафесія, Радзіма, патрыятызм, самаахвярнасць…)*

Аднавіце паслядоўнасць падзей апавядання, паставіўшы пункты плана ў правільным парадку *(праца ў парах, прыём "Пераблытаны план")*.

*Варыянт плана апавядання:*

1. *Хітрыкі Косці.*
2. *Знаёмства з настаўнікам Апалінарыем Феакціставічам.*
3. *Знешні выгляд настаўніка і рысы яго характару.*
4. *Павага вучняў да настаўніка.*
5. *Знаёмства вучняў з Авідзіем.*
6. *Развітальны падарунак Косцю.*
7. *Геройская смерць настаўніка.*
8. *Бамбардзіроўка гарадка.*
9. *Косця Кветка – настаўнік.*

**Настаўнік.** У адным са сваіх твораў Іван Навуменка пісаў: "У тыя далёкія гады я глядзеў на настаўнікаў як на нейкіх вышэйшых істот. Я не дапускаў нават думкі, што яны могуць быць самымі звычайнымі людзьмі… Я цвёрда верыў, што нашы педагогі жывуць нейкім асаблівым, ідэальным жыццём…". Калі ж прыйшоў час выбіраць прафесію, Іван Навуменка стаў настаўнікам. Як вы думаеце, чаму?

Абапіраючыся на змест твора, запоўніце анкету.

Імя ___________ (*Апалінарый Феакціставіч*)

Мянушка __________ (*Цыркуль*)

Прафесія ________________ (*Настаўнік*)

Прадмет, які выкладае _______ (*Чарчэнне, маляванне*)

Захапленне ____________________ (*Лацінская мова*)

Знешні выгляд ____________________ ("*Высокі, тонкі, у чорным, яшчэ царскіх часоў, сурдуце", "старамодны, крыху напышлівы*").

Работа па тэорыі літаратуры. Узнаўленне паняцця "мастацкая дэталь".

**Настаўнік.** Успомніце, што такое мастацкая дэталь. Дапішыце прапушчаныя словы (прыём "Белыя плямы", можа быць прадстаўлены ў двух варыянтах: са словамі для даведак і без іх).

*Мастацкая дэталь – асаблівa _______ , вылучаны элемент мастацкага вобраза, выразная ______________ у творы, якая ____________ аўтарскае стаўленне да герояў і падзей.*

Пытанні вучням

- ✓ На якую мастацкую дэталь вы звярнулі ўвагу ў знешнім выглядзе настаўніка?
- ✓ Што вас здзівіла ў выкладанні Апалінарыем Феакціставічам свайго прадмета?
- ✓ Як вы разумееце выраз "Радзіму нашу любім і абараняць яе павінны"?

**III. Завяршаючы этап. Рэфлексія**

**Настаўнік.** Прачытайце звесткі пра Авідзія і запоўніце кластар, вызначыўшы, хто для каго быў настаўнікам.

***Гістарычная даведка:*** *Выдатны рымскі паэт Публій Авідзій Назон нарадзіўся ў Італіі, рос у багатай сям'і і атрымаў добрую адукацыю. Цікавасць да паэзіі з'явілася ў раннім юнацтве. Ён паступова пачынае пісаць. Вядомасць прыйшла да яго адразу. Так склалася, што Авідзій трапляе ў выгнанне. Прычына: вершы, у якіх імператар Аўгуст пабачыў падрыў устояў сям'і і амаральнасць. Дзесяць гадоў ссылкі. Але Авідзій не пакідае пісаць, свае кнігі ён прысвячае роднай краіне і людзям, перасылае іх у Рым сваёй сям'і і сябрам. Смерць на чужыне. Але несумненна адно: Авідзій заставаўся чалавекам, які любіў сваю Радзіму, нягледзячы ні на што.*



*Варыянт адказу:*




**Настаўнік.** Прачытайце словы Плутарха, паразважайце над іх сэнсам.

Вучань – гэта не пасудзіна,
якую трэба напоўніць ведамі,
А факел, які трэба запаліць.
А запаліць факел можа толькі той,
Хто сам гарыць.

Чым напоўніў жыццё сваіх вучняў кожны з настаўнікаў? (*Любоўю да Радзімы, адказнасцю перад Бацькаўшчынай і сваёй справай, вернасцю сваім поглядам і інш.*)

Давайце адкажам на пытанне, якое мы паставілі ў пачатку ўрока: "Якім павінен быць настаўнік, каб стаць прыкладам для сваіх вучняў?"

*(Настаўнік павінен не толькі добра выкладаць свой прадмет, але і быць прыкладам для сваіх вучняў, быць верным сваім ідэалам і перакананням, любіць Радзіму і абараняць яе).*

У чым каштоўнасць для вашага пакалення духоўнага вопыту гэтых настаўнікаў? Выберыце якасці герояў, якія б вы хацелі пераняць у іх і ўзяць з сабой у далейшае жыццё.

*(Быць верным сваім ідэалам; любіць Радзіму і абараняць яе; любіць сваю прафесію; мець захапленне; любіць людзей; быць прафесіяналам; быць высакародным; быць справядлівым).*

Выстаўленне і каменціраванне адзнак.

**Дамашняе заданне**

Пісьмова адкажыце на пытанне “Ці заўсёды ёсць у жыцці месца подзвігу?” (з апорай на змест літаратурнага твора).

## Літаратура


1. Беларуская літаратура: вучэбны дапаможнік 7 клас/ М.А. Лазарук, Т.У. Логінава, 2023.
2. Аповесці, апавяданні: для сярэд. і стар. шк. узросту / Іван Навуменка; склад. З.І. Падліпская. – Мінск: Беларусь, 2009. – 351с.
3. Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі: https://narbel.bsu.by/ivan-navumenka-zhyccyovy-i-tvorchy-shlyax/